Технологическая сторона нашей цивилизации постоянно развивается, идет вперед. Мы уже создали техносферу, но в моральном отношении наступает решительный регресс. Раньше видел все более оптимистично. Верил в мощь разума, в силу открытий. Очевидно, до времени. Не предвидел одного, что наука станет почти целиком подчинена коммерции. Большинство ученых работает по призванию, но и для того также, чтобы стать Нобелевским лауреатом. Поспешно оглашаются какие-то научные гипотезы, результаты исследования, только затем, чтобы опередить других и получить чем поскорее деньги на дальнейшую работу. Позже часто оказывается, что это были псевдооткрытия. Лучше всего оплачиваются, разумеется, исследования, которые касаются разработки новых видов оружия. Вывод напрашивается сам. Человек — это обезьяна, которая сумеет сделать найточнейшую бритву, чтобы перерезать горло другой обезьяне.

Может быть после Лема трудно написать классическую повесть в жанре научной фантастики, как трудно сделать классический вестерн после серии антивестернов.

Не могу скрыть, что в моих повестях посыпал выкроенную действительность юмором и гротеском, наподобие того, как торт посыпают сладкой пудрой. Кто-то в Германии написал обо мне, что научная фантастика была только моим нарядом, плащем Проспера, под которым укрыт скелет философии.

И пан Станислав согласен?

В определенном смысле должен согласиться. Предвидел не только определенные научные открытия, но также их общие результаты и последствия. Так было с виртуальной действительностью, в отношении которой с самого начала был скептиком. Стивен Хокинг, выдающийся физик, утверждает, например, что существует поливерсум, или множество космосов. Я когда-то в шутку написал, что существует мультиверсум. Теперь оказывается, что есть такая научная гипотеза. Человек пишет бог ведает что, а потом его спрашивают: откуда пан знал? Не знал, просто так мне пришло в голову. Никогда не садился к столу с заданием: а сейчас напишу что-нибудь очень глубокое. Писал то, что хотелось, не думая, что это мелко или глубоко. Сам дивлюсь, что немцы делают из меня философа. По мнению одних, я последователь Шопенгауэра, по мнению других мне ближе Шеллинг, которого я никогда в жизни не читал. В энциклопедии фигурирую как философ, а не писатель. Всегда был невидимкой. То, что писал на темы будущего, виртуальной действительности, киберпространства, клонирования, трактовалось несерьезно. А теперь оказалось, что подводная лодка, которой я был, начинает выходить на поверхность.

У критиков всегда были проблемы с паном Лемом, потому что никому в литературе Лем не соответствовал.

Тем не менее я был широко переводимым писателем. Мои книги вышли на 37 языках. Пользуясь классификацией советского времени, могу сказать о себе, что я — космополит. Интересуют меня судьбы человечества, а не отдельные религии. Нравится мне, правда, буддизм с его уважением ко всем живым существам, но лично я — агностик, чего не скрываю, и что в настоящее время будит у многих ужас.

Говорит пан Лем о себе, что оптимист или понемногу и оптимист, и пессимист. Но ничего оптимистического от пана Станислава я не услышала.

Оптимистично то, что после смерти властвует небытие. Странным делом было бы миллионы лет вглядываться в облик Пана Бога, зная, что и через следующий миллион миллионов лет все будет также. Большей скуки не могу себе вообразить. Мы не созданы для вечности. Но, с другой стороны, в небытие также никто не стремится.

Интервью Ст. Лема корреспонденту польского журнала «Polityka» (№ 46, 1998). Печатается в сокращении.

«Нейродюбель» – ідэя Кулінковіча

Узмацненне ад прэзідэнцкай улады, каралеўская на Беларусі ўжо змянілася. 30 студзеня рок-каралі мінулага года (беларускамоўны гурт НРМ) перадалі вялікую крышталёвую карону рускамоўнаму «Нейродюбелю». Як гэтая падзея паўплывае на моўную сітуацыю на Беларусі, пакажа час. Але лідэр гурта «Нейродюбель» Аляксандр Кулінковіч лічыць сваю групу чыста беларускай, нягледзячы на рускамоўныя тэксты: «Я магу пісаць тэксты толькі на той мове, на якой я думаю. А, на жаль, думаць па-беларуску ні бацькі, ні школа, ні савецкае мінулае не навучылі. Тым больш, нельга ва ўмовах сённяшняй Беларусі адмаўляць у патрыятызме толькі зыходзячы з пазіцыі мовы».

Прапануем вам гутарку з



рок-каралём Беларусі, лідэрам гурта «Нейродюбель» Аляксандрам Кулінковічам.

— Што ты адчуў, калі прачнуўся каралём?

— Поўную пустату. Гэта, канечна, смешна гучыць, але, калі Аляксандр Македонскі падышоў да Індыйскага акіяна, ён заплакаў.

— А шкляная карона не цісне?

— Не, увогуле на галаву не налазіць.

— Трэба адзначыць этапы вялікага шляху А.К. у мастацтве. Па-першае, Саша, колькі табе гадоў?

— 27 будзе ў траўні, калі дажыву.

— І калі ў юнага Сашы прачнулася любоў да рок-музыкі?

— Гадоў, напэўна, у дзесяць мяне вельмі ўразіла нейкая з кампазіцыяў *«Kiss»*. Я пачаў задумвацца. А гадоў напэўна ў дванаццаць мяне на гэтую справу пачаў пасоўваць усімі любімы калектыў *«Beatles»*. Я зразумеў: хачу быць музыкантам, і буду калі-небудзь. Потым аднойчы, да майго сораму вельмі позна, дзесьці ў трынаццаць гадоў, пачуў гурт «Машина времени», і мяне так уразіла, што чалавек па-руску спявае так файна, такія выдатныя тэксты. І я падумаў, чаму я не магу так пісаць. Я ўзяў і напісаў песню, як мне тады здавалася.

— Ты яе памятаеш? Як яна называлася?

— Ды не, канешне, яна не захавалася, але гэта і неістотна. Папросту, мне спадабаўся гэты занятак. І потым пайшло. Быў сабраны першы склад майго гурта. Ён называўся *«Swamp»*, у перакладзе з ангельскай — балота. Граць ніхто з нас не ўмеў. Гралі на рондалях, вываркаў. У нас быў рухавік ад пральнай машыны, мы клалі яго ў вялікую вываркў і ўключалі ў разетку, і ён выдаваў псіхадэлічныя гукі. Мы запісалі цэлыя тры песні і паспяхова распаліся.

— А колькі гадоў існуе ўласна «Нейродюбель»?

— 17 ліпеня «Н» споўніцца дзесяць гадоў. 17 ліпеня 89 года я прыдумаў «Н» як ідэю і сыграў першую песню. А цяперашні канцэртны склад існуе ўжо сем ці, нават, восем гадоў. Гэта Максім Паравой — гітара, Юры Навумаў — гітара, Стас Паплаўскі — бас-гітара, Максім Івашын — клавішы, Андрэй Сцепанюк — бубны.

— І праз восем гадоў вы дайшлі да рок-кароны. Скажыў, гэта так істотна атрымаць галоўны рок-прыз?

— Так. Гэта вельмі цікавая рэч. Усе музыкі кажуць: цьфу, Рок-каранацыя, пляваць я на яе хацеў. Я таксама так казаў. Ну што там нейкая крышталёвая вазачка. Але, гэта адчуваньне ўсё ж такі пэўнага прызнання. Усе ж такі, рок-карона ў нашай рэспубліцы, я лічу, галоўная рэальная рок-н-рольная ўзнагарода, і кожны рок-музыкант да яе імкнецца. Што б хто ні казаў, а рок-карону хоча атрымаць кожны. Мы яе атрымалі, і гэтае адчуванне — 15 хвілінаў славы на сцэне — незабыўнае...

Магдалена Н.

ЦАРКВА І ШКОЛА

Пра якое збавенне клапоціцца міністр

У «Настаўніцкай газеце» (№ 9 за 28.01.99) надрукаваны, прычым у перакладзе на беларускую мову, артыкул лукашэнкаўскага міністра адукацыі сп.Стражава «Пра сістэму выхавання, дзяржаўную ідэалогію і школу». Міністр канстатуе, што *«страціла свой уплыў марксісцка-ленінскае вучэнне, аслабела выхаваўчая роля сям'і, а царква не набыла той сілы ўплыву, што мела»*, і тым не менш прабівае ідэю, што царкву трэба вярнуць у школу. Асабіста я заўсёды з падазронасцю ставіўся і стаўлюся да спробаў дзяржавы ўціснуцца ў глыбока містычныя дачыненні чалавека і Усявышняга. Тым болей, калі гэта такая дзяржава, як сённяшняя Беларусь.

Спадар Стражаў прыводзіць прыклад суіснавання царквы і дзяржавы ў царскай Расіі, цытуючы лозунг графа Уварава, здаецца, таксама міністра асветы: «Праваслаўе, самадзяржаўе, народнасць». Пра тое, якая была царква ў Расіі, можна яшчэ паспрачацца: хутчэй, гэта быў дэпартамент дзяржавы, і калі бальшавікі адкрылі народу вочы, што Бога няма, хрысталюбівы расійскі народ сваімі ж рукамі паскручваў макаўкі цэрквам, галовы папам і ахвотна «ў царкву пагнаў табун». Пасля бальшавіцкага пагрому Расія ніколі не будзе рэлігійнай краінай, як гэта здарылася, скажам, і ў Францыі пасля якабінскага пагрому канца XVIII—пачатку XIX ст.

Вельмі расчульвае спасылка на прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнку як на штурхача хрысціянскіх каштоўнасцяў у дзяржаўную ідэалогію. Кожнаму ў Беларусі вядома, што А.Р. Лукашэнка абвясціў сябе «праваслаўным атэістам». Калі б я быў праваслаўным, то палічыў бы гэта абразаю маёй канфесіі. Пра набожнасць і хрысталюбівасць ППРБ сведчыць хоць бы тое, што ён, цяпер ужо, мабыць, без дадатку «атэіст» — што значыць «бязбожнік», скасаваў кананічна святы дзень — Велікодны панядзелак. Як кажуць, па справах бачым...

Канечне, не варта асоба адзначаць, што ў ролі выхавацелькі дзяцей у школе міністр Стражаў бачыць выключна праваслаўную царкву. Беларусь — поліканфесійная краіна, і такая арыентацыя афіцыйнага Мінска выкліча і выклікае пярэчанні. Мы не малыя дзеці і ведаем, якую афарбоўку мае праваслаўе сёння ў Беларусі. Гэта прамаскоўскае дзяржаўнае праваслаўе, якое так і не пакаялася ў супрацоўніцтве з бальшавіцкімі карнымі органамі, якое супрацоўнічае з імі па сённяшні дзень.

Я чытаў артыкул Васіля Стражава і не мог пазбавіцца пачуцця, што ўсё гэта неяк ненатуральна, нацягнута. Што, ён увядзе пасаду намесніка дырэктара па праваслаўі? А мо загадае ствараць камісіі па дастойнай сустрэчы Другога Прышэсця? Ад гэтых праваслаўных атэістаў чаго хочаш можна чакаць. Яны, як кажуць, лоб разаб'юць...

І яшчэ я заўсёды трошкі падазрона ставіўся да гэтых фірмовых налепак — праваслаўны, каталік, лютэранін.... Вельмі мала людзей могуць сказаць і кажуць пра сябе «я хрысціянін». Такая фармулёўка можа лучыць людзей, а спробы ўнесці ў гарадскую нацыю XXI стагоддзя архаіку феадальнай Расіі XIX стагоддзя — проста пражэкт. Школа павінна заставацца па-за рэлігіяй, і рэлігійныя справы — гэта глыбока асабістыя справы. Хрысціянства мае на мэце збавенне душы чалавека, яно не ёсць прылада ці цацка праваслаўных атэістаў.

Спасылкі на практыку іншых дзяржаваў, дзе рэлігія нейкім чынам прысутнічае ў школе, малааўтарытэтныя. У тых дзяржавах не было перапынку ў рэлігійнай практыцы, і там гэта больш-менш натуральны працэс. У нас жа большасць насельніцтва аніяк не звязана з хрысціянствам, мы, па сутнасці, пераважна паганская краіна. Хрысціянства ў нас існуе ў паганскай форме. Спытайце сёння школьнікаў, ці хрышчаныя яны — і каля 80—90 працэнтаў адкажуць станоўча, але амаль нічога з дактрыны хрысціянства яны не ведаюць. Нават «Ойча наш».

Я думаю, што нашая грамадскасць мусіць пратэставаць супраць таго, каб каляхрысціянскія праваслаўна-атэістычныя колы браліся за збавенне дзіцячых душаў. Тым больш, што не збавенне душаў іхняя мэта. У дэідэалагізаваную школу лезе нейкая яшчэ неакрэсленая, але яўна з адмысловым пахам, ідэалогія. Зноў, як і пры камуністах, настаўнікі будуць абвешчаныя «ідэалагічнымі работнікамі», а школа — «ідэалагічнай установай». Зноў «органы» будуць прынюхвацца, хто як пахне, і г.д. І ці не праваслаўю тут адводзіцца роля барана-тарана?

Вось чаму кожны вольны чалавек мусіць выказаць сваю нязгоду з умяшальніцтвам дзяржавы ў рэлігійныя справы.

Мікола БУСЕЛ

НАШЫ БАЖНІЦЫ



ПИЛИГРИМКА

Бебиситеру надо шесть рук

Все знают, что бытие определяет мечтания. Не возьмусь гадать, о чем мечтал Колумб, когда собирался открывать Новый Свет, но убеждена, что не мечтал он в результате поездки приобрести однокомнатную квартиру. Меня на путешествие за океан подвигла исключительно эта мечта — купить однокомнатную квартиру в Минске. Она возникла в тот день, когда мне попало на глаза газетное объявление фирмы, предлагавшей помощь в поездках на заработки в США в качестве бебиситера (уход за детьми). Главным в объявлении была гарантия минимального заработка 180 долларов в неделю. Умножив 180 на 4 недели и на 12 месяцев, я получила сумму 8.740.

Я позвонила в фирму, сфотографировалась, заплатила 10 долларов за постановку на учет, заполнила анкету сведениями о своих достоинствах и высшем образовании, отвращении к алкоголю и умении водить «запорожец». Довольно скоро пришел ответ, что я соответствую американским требованиям к бебиситерам. Это дало мне право заплатить еще 60 долларов за курсы спецконсультаций и английского языка, что отняло полтора месяца моей жизни. Наконец наступил счастливый день, когда надо выложить 680 долларов за авиабилет (туда и обратно). Можно поехать и за счет фирмы, но это обойдется на 1.000 долларов дороже по причине каких-то страховок. Я объездила всех друзей и собрала зеленые бумажки разного номинала. Пробил назначенный час, и мы — пять женщин из Беларуси — сначала самолетом компании «Белавиа», затем «Боингом» — пролетели над Европой и Атлантическим океаном и оказались в аэропорту Кеннеди.

Нас встретили и повезли в офис фирмы — двухкомнатную квартиру в полуподвале на окраине Нью-Йорка. Там и началось наше удивление, разочарование и отрезвление. На наши вопросы о месте работы и так далее нам давали такой ответ: «Здесь вам никто не обязан», «Тут все стоит дорого, за все надо платить, вам надо запастись терпением». За неделю ожидания я познакомилась со многими соотечественницами, получившими опыт бебиситерства. Некоторые уезжали домой после семи месяцев работы, некоторые после двух. Рассказы не заряжали оптимизмом.

Не прибавляли радости и частые посещения офиса недовольными бебиситерами, которых обижают и хозяева, и дети, способные на множество мелких оскорблений, вплоть до плевков. Все мечтают попасть в стопроцентную американскую семью. Такая возможность не исключена. Но надо пройти специнтервью, на которое придется ехать за свой счет в другой штат, что крайне дорого. Требуется впридачу документ об иязовском образовании (чтобы в итоге обрести право на уборку, стирку, приготовление завтраков и т.п.). Правда, цели у приезжих неодинаковые. Молодые женщины надеются на счастливый брак с состоятельным американцем. Надежды, естественно, порождены идиотской легендой об избытке в Америке мужчин и недостатке женщин, о культе семьи, которому преданы американские мужчины. Приятно, конечно, заблуждаться.

Мое место работы находится в часе езды от Нью-Йорка, в штате Нью Джерси. Хозяева живут в поселке, застроенном особняками. Дом — двухэтажный, с подвальными помещениями и мансардой. На первом этаже — просторный зал. Полы в спальнях, детских комнатах, рабочем кабинете — с ковровым покрытием (придется пылесосить). Три зеркальные ванные комнаты. Кухня оборудована самой современной техникой — вплоть до механизма, который наподобие мясорубки измельчает пищевые отходы для сброса в канализацию. Во дворе — бассейн. Стоимость особняка 300.000 долларов.

Считается, что американцы большие рационалисты. И правда, чтобы купить что-нибудь подешевле, мои хозяева могут поехать не то что на другой конец Нью-Йорка, но в другой штат. Бдительно следят за рекламой всевозможных распродаж. Экономится электроэнергия (во всех комнатах установлены регуляторы света), но в доме работает отопительно-охлаждающая система, которая автоматически поддерживает нужную температуру, ежедневно в стиральную машину закладывается партия белья. Больших расходов электроэнергии и воды требует посудомоечная машина. Несъеденную пищу всегда выбрасывают, а не хранят в холодильнике, как заведено у нас.

При всей этой механизации я ни физически, ни морально не могу совмещать в одном лице уборщицу, кухарку, гувернантку и нянечку. На моем попечении двое детей — годовалый ребенок, который еще не умеет ходить, и четырехлетний, который хоть и умеет ходить, но не приучен самостоятельно есть, его надо кормить из ложечки, забавляя сказками. Ругать, а тем более наказывать детей — не положено. Отложить кормление до того часа, когда у дитяти проснется аппетит — тоже запрещается. Потому что: «У нас так принято!»

Своего уголка у меня нет. Только диван в 10-метровой комнатке рядом с малышом и «место» в стенном шкафу. По телевизору можно смотреть 50 различных программ, но нет ни времени, ни желания. Тягая по трем этажам пылесос, наводя блеск в трех ванных и туалетах, чистя раковины и загружая посудомоечную машину, кормя с ложечки двух мальчиков, убаюкивая одного и собирая игрушки за другим, — как-то невольно начинаешь задаваться экзистенциальным вопросом: неужели это я? В какой-то момент я начала видеть себя со стороны — вот некая женщина из Беларуси безостановочно пылесосит, стирает, кормит, нянчит и т.д. Поздним вечером забирается в постель и сдерживает слезы. В воскресенье едет посмотреть Нью-Йорк, чтобы убедиться в своем полном одиночестве. После трех месяцев такой жизни однажды утром я проснулась с чувством, что сойду с ума, если останусь бебиситером, кухаркой, уборщицей. Лежу и чувствую всеми фибрами, что психически и морально сломаюсь, если продолжу эту работу. Все мои знания об Америке уложатся в короткие рассказы о том, как надо убирать трехэтажный особняк, чистить унитазы и кормить мальчиков с ложки. Стоят ли восемь тысяч долларов такого морального износа и психической травмы?

Когда я появилась в офисе фирмы и объявила, что хочу незамедлительно вернуться в Беларусь, меня стали отговаривать: «Поищем другую семью, с меньшим домом и более взрослыми детьми, или с одним ребенком». Приводили примеры удачливых бебиситеров: работа по уходу за одиноким стариком в двухкомнатной квартире. «Мало уборки и стирки. Много свободного времени, чтобы узнать Америку». Но даже возможность такой удачи меня уже не прельщала. Возможно, мне не хватило упрямства и терпения.

И все пошло в обратном порядке: аэропорт Кеннеди, аэропорт «Минск-2» и, наконец, моя тесная 22-метровая квартира. Не передать словами счастья от возвращения в знакомые стены, требующие ремонта. Придется вернуть долги, но зато сколько я узнала за океаном в трехмесячный срок!

Тамара ЯРКЕВИЧ,
Минск

От редакции

Редакция познакомила с этим рассказом нескольких более удачливых бебиситеров и тех, кто вернулся, и родственников тех, которые остались там на постоянное проживание. Общее мнение было такое. Не надо ехать в Америку, если рассчитываешь работать там, как привык работать тут. Любой успех приходит постепенно, человек, работая на первом месте, постепенно отыскивает лучшее, увеличивая заработки с 500 долларов в месяц до 1.500—2.000 долларов. Но нужна воля, чтобы победить в себе советскую амбициозность, гордость высшим образованием и привычкой к 8 часам работы, из которых 4 уходили на мечты или болтовню. Из четверых наших знакомых женщин, что поехали в США бебиситерами, двое поступили учиться в колледж, одна вышла замуж, четвертая работает пятый год, получая в неделю 485 долларов. Самое простое — съездить, сдаться и вернуться к нерешенным проблемам. Ничего не добьешься, не переделав себя.

Сляды вядуць у Расію

Уладзімір АРЛОЎ



Крыж Еўфрасінні Полацкай.

У лета 6669-е ад стварэння свету, а ад нараджэння Хрыстовага — 1161-е, знакаміты полацкі мастак-ювелір Богша, у хрышчэнні Лазар, стварыў на заказ ігуменні Спасаўскага манастыра шасціканцовы ўзвіжальны крыж. Святыня была зробленая з кіпарысавага дрэва, якое зверху і знізу закрывалі залатыя пласткі, аздобленыя каштоўнымі камянямі, арнаментальнымі кампазіцыямі і дваццаццю вытанчанымі эмалевымі абразкамі з выявамі святых. У пяці «гнёздах» знаходзіліся прысланыя ў Полацк з Візантыі хрысціянскія рэліквіі, найкаштоўнейшымі з якіх лічыліся кавалачкі Крыжа Гасподняга з кроплямі Ісусавай крыві і драбок каменю ад дамавіны Багародзіцы. Паводле задумы ігуменні, святыня павінна была вечна «жыватварыць» душы палачанаў і ўсіх жыхароў роднае зямлі.

Заказчыца крыжа ўжо шмат стагоддзяў шануецца як святая Еўфрасіння Полацкая, нябесная заступніца беларускай зямлі, а шэдэўру майстра Богшы наканавана было стаць нашай агульнанацыянальнай рэліквіяй — сімвалам хрысціянскай святасці і старажытнай дзяржаўнасці Беларусі.

Жыватворны полацкі крыж меў заклён, што абяцаў страшную кару таму, хто ўкрадзе, аддасць ці прадасць святыню. Але, не зважаючы на гэта, рэліквію чакаў драматычны лёс, варты цэлай кнігі. Неўзабаве пасля завяршэння зямной дарогі Еўфрасінні крыж вывезлі ў Смаленск, адкуль ён трапіў у Маскву. У 1563 годзе, замольваючы свае ўчыненыя ў Полацку крывавыя злачынствы, Іван Грозны вярнуў святыню ў Спасаўскі манастыр. Але адысея крыжа святой Еўфрасінні толькі пачыналася.

Два з паловаю стагоддзі рэліквія захоўвалася ў праваслаўным, а потым уніяцкім Сафійскім саборы. Крыж спрабавалі адсудзіць езуіты. У 1812-м манахі-базыльяне замуроўвалі яго ў сцяне храма. Пасля знішчэння Уніі былы грэка-каталіцкі арцыбіскуп Васіль Лужынскі, што перайшоў у праваслаўе, зрабіў з Крыжам падарожжа ў Пецярбург і Маскву, дзе сабраў для сваёй епархіі багатыя ахвяраванні, якія, зрэшты, перад ад'ездам «старэйшыя браты» адабралі ў владыкі на карысць крамлёўскіх цэркваў. З 1841 года святыня знаходзілася ў сваім спрадвечным месцы ў полацкім храме Спаса.

Наша стагоддзе прынесла полацкаму крыжу найцяжэйшыя пакуты. У 1921-м яго рэквізавала ОГПУ, якое займалася ў краіне ўсім, у тым ліку і нацыянальнымі святынямі. Напрыканцы трывожных 20-х, калі ўжо распачыналася расправа з беларускай інтэлігенцыяй, былы прэм'ер БНР, дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея Вацлаў Ластоўскі знайшоў зняважаны і абрабаваны крыж (тры эмалевыя выявы святых выламаныя, трынаццаць папсаваныя, каштоўныя камяні замененыя фарбаваным шклом) у Полацкім фінаддзеле. Ластоўскі забраў рэліквію ў Мінск. 21 лістапада 1929 года фельд'егер ОГПУ перавёз крыж у Магілёў, куды — падалей ад непрыемнага суседства «міжнароднай буржуазіі» — меркавалася перанесці сталіцу БССР.

У музейнай экспазіцыі святыня не затрымалася, бо шмат хто з наведвальнікаў пачаў перад ёю маліцца. Улады палічылі, што найлепшае месца для крыжа — будынак абкама партыі, дзе быў адмысловы пакой з кратамі на вокнах і падвойнымі броневанымі дзвярыма. Якраз адтуль у 1941 годзе святыню, паводле афіцыйнай да нядаўняга часу версіі, і выкралі нямецка-фашысцкія захопнікі. (Чаго толькі не спісвала на іх прапаганда! Напрыклад, у Полацку і цяпер часам можна пачуць ад экскурсаводаў, што гістарычны цэнтр горада разбамбілі немцы, хоць у сапраўднасці ён быў амаль цалкам знішчаны масіраваным налётам савецкай авіяцыі 28 траўня 1944 года, а сабор св.Стэфана «нямецка-фашысцкія захопнікі» зруйнавалі ў 1964-м.)

Але ж Магілёў знаходзіўся за паўтысячы кіламетраў ад дзяржаўнай мяжы, і час дазваляў правесці эвакуацыю каштоўнасцяў. Гэта і спаразіла размовы, што рэліквія ў гады ваеннага ліхалецця паехала на ўсход. Так званыя кампетэнтныя органы расследавання чамусьці не праводзілі або вялі яго таемна, што толькі спрыяла чуткам. На запыт Магілёўскага абласнога музея наконт лёсу святыні з Эрмітажа прыйшоў не падмацаваны ніякімі дакументамі адказ, што Крыж Еўфрасінні Полацкай трапіў у збор мільянераў Морганаў і знаходзіцца ў Нью-Йорку. Гэтая заблытаная гісторыя прыцягнула ўвагу вядомых вучоных — археолага Георгія Штыхава і літаратуразнаўцы Адама Мальдзіса, аднак іх звароты да вышэйшых рэспубліканскіх інстанцыяў засталіся ў той час без адказу.

Крыж шукала і беларуская эміграцыя. Доктар Вітаўт Тумаш у 1947 годзе ўпершыню апублікаваў у «Запісах Беларускага Інстытута навукі й мастацтва» ў Нью-Йорку дакументы аб первозцы нацыянальнай святыні з Мінска ў Магілёў, у тым ліку і сам падпісаны Вацлавам Ластоўскім акт перадачы. Разам з яшчэ адным вядомым прадстаўніком нашай дыяспары ў ЗША Вітаўтам Кіпелем Тумаш спрабаваў, але безвынікова, весці росшукі і ў Морганаўскіх установах — бібліятэцы і калекцыі твораў мастацтва.

Паралельна з гэтымі намаганнямі лёсам нашай рэліквіі заняўся прадпрымальны супрацоўнік Эрмітажа Бебут Шаўкоўнікаў. Не афішуючы сваёй дзейнасці, ён прыватным чынам прыехаў у ЗША, імкнучыся пранікнуць у зборы Морганаў, але выявіў празмерны імпэт і атрымаў ад нейкіх маладзёнаў атлетычнага выгляду ветлівую прапанову супакоіцца. У адваротным выпадку яны не гарантавалі госцю з СССР вяртання дадому.

Амаль на два дзесяцігоддзі пошукі прыпыніліся. Іх працягнуў ужо ў 90-я гады беларускі журналіст Аляксандр Лукашук. Ён наведаў у Нью-Йорку фундацыю Моргана, звярнуўся ў прыватнае агенцтва, што выдае сусветны каталог скрадзеных твораў мастацтва. Таямніца Крыжа не давала спакою і Адаму Мальдзісу. Вучоны быў у ліку тых, хто суправаджаў у час візіту ў Мараганаўскі фонд тагачаснага міністра замежных спраў БССР Пятра Краўчанку. Тады, у кастрычніку 1990 года, знешнепалітычнае ведамства Беларусі звярталася ў фундацыю Моргана наконт Крыжа святой Еўфрасінні і атрымала афіцыйны адказ, што там нацыянальнай святыні беларусаў няма.

Вузкія межы газетнага нарысу змушаюць пакінуць «за кадрам» не менш за дзесятак іншых, звязаных з пошукамі Крыжа, версіяў і сюжэтаў. (Найбольш поўна яны выкладзеныя аўтарам гэтых радкоў у кнізе «Жыватворны сімвал Бацькаўшчыны», выдадзенай у 1998 годзе дзякуючы Згуртаванню беларусаў свету і Міжнароднаму дабрачыннаму Фонду Крыжа святой Еўфрасінні.)

За апошнія гады шмат зрабіў у расследаванні загадкавай гісторыі знікнення рэліквіі супрацоўнік упраўлення КДБ па Магілёўскай вобласці Сяргей Багдановіч. Яго пяру належаць некалькі грунтоўна дакументаваных публікацыяў у перыёдыцы, сярод якіх і артыкул пад красамоўнаю назваю «І ўсё ж след вядзе на ўсход», надрукаваны ў 1997 годзе ў газеце «Рэспубліка». У выніку пошукаў С.Багдановіча мы маем сёння ўспаміны жыхара Магілёва Пятра Паддубскага, які непахісна ўпэўнены, што ўлетку 1941-га менавіта ён вывозіў на сваёй машыне Крыж Еўфрасінні ў Расію.

У сярэдзіне ліпеня першага ваеннага года вайсковы кіроўца Паддубскі атрымаў ад начальніка магілёўскага гарнізона І.Ваяводзіна загад забраць з абкама партыі важны груз. Некалькі чалавек у цывільным узяліся цягаць у машыну мяшкі і пакункі. Найдаражэйшыя рэчы запакоўвалі ў акутую жалезам скрынку. Паддубскі пачуў, як хтосьці з «грузчыкаў» усклікнуў: «Які крыж прыгожы!» Потым машыну ўзялі пад ахову шасцёра супрацоўнікаў НКУС на чале з маёрам. На гарадской ускраіне ў кабіну сеў першы сакратар ЦК КПБ П.Панамарэнка. Далей невялікая аўтакалона з трох машын рухалася па маршруце Магілёў—Горкі—Смаленск—Мажайск—Масква і праз два дні і дзве ночы спынілася на Ленінскіх гарах, каля ўпраўлення кадраў Чырвонай Арміі. Гэты аповяд ускосна пацвярджаецца ўспамінамі і самога П.Панамарэнкі, і каменданта Магілева І.Ваяводзіна.

С.Багдановіч лічыць, што магілёўскія каштоўнасці сёння могуць знаходзіцца ў Эрмітажы або ў музейных сховішчах Уфы і Самары, куды ў час вайны трапілі архівы абкама партыі. З думкай калегі з большага пагадзіўся, даючы інтэрв'ю газеце «Звязда» (19 чэрвеня 1997 г.), кіраўнік цэнтра інфармацыі і грамадскіх сувязяў КДБ Беларусі Г.Сенюкоў: «...можна меркаваць, што ўсе рэчы (з Магілёва — **У.А.**) аселі дзенебудзь у правінцыйным расійскім музеі ці архіве». Да-



Будынак у Магілёве, адкуль у ліпені 1941 года знікла наша нацыянальная святыня.

лей прадстаўнік КДБ выказваў аптымістычны прагноз: маўляў, калі Крыж святой Еўфрасінні сапраўды знойдзецца ў Расіі, добрыя дачыненні паміж дзвюма дзяржавамі дапамогуць вярнуць святыню.

Як мы ведаем, расійскі Закон аб рэстытуцыях перакрэсліў падобныя спадзяванні. Тым больш, у нашай краіне за гады незалежнасці так і не была выпрацаваная дзяржаўная палітыка адносінаў да нацыянальнай спадчыны, а рэальны клопат пра яе ўлады падмяняюць дэмагагічнымі лозунгамі «славянскага адзінства» і пампезнымі, надзвычай дарагімі і сумнеўнымі ў эстэтычным і духоўным сэнсе імпрэзамі кшталту «Славянскага базару».

Даты і лёсы

5 лютага

1914. Нарадзіўся пачынальнік руху «бітнікаў» у амерыканскай літаратуры Уільям Бэроуз.

1919. Авіякампанія *Lufthansa* распачала першыя ў свеце штодзённыя пасажырскія рэйсы паміж Берлінам і Веймарам. Палёт на адлегласць 195 км доўжыўся тады 2 гадзіны 18 хвілінаў.

1939. У ГУЛАГу загінуў вядомы беларускі гісторык, былы прэзідэнт АН БССР (1931—36) і адзін з рэдактараў перакладу твораў Леніна на беларускую мову Павел Горын.

1986. Амерыканец Эдвін Таўнсенд быў прызнаны найстарэйшым парашутыстам у свеце: у гэты дзень ён скочыў з парашутам, маючы 89-гадовы ўзрост. У жанчын адпаведны рэкорд належыць 80-гадовай англічанцы Сільвіі Брэт: яна ўсталявала яго 23 жніўня таго ж года.

1994. У Мінску была заснаваная Ліберальна-дэмакратычная партыя Беларусі.

6 лютага

1515. Памёр італьянскі першадрукар Мануцыи Альдус, вынаходнік курсіўнага шрыфта (1501) і танных кніг у мяккіх папяровых вокладках (1495).

1665. Нарадзілася брытанская каралева Анна, падчас царавання якой аб'ядналіся парламенты Англіі і Шатландыі (1707). Анна нарадзіла свайму мужу, прынцу Дацкаму Георгу, 17 дзяцей, але ўсе памерлі ў маленстве. У гэты ж дзень у 1952 г. на брытанскі трон узышла цяперашняя каралева Лізавета.

1802. Нарадзіўся англійскі фізік Чарльз Уітстан, які ўдасканаліў тэлеграф і вынайшаў вуснавую гармоніку.

1914. Нарадзіўся вядомы беларускі паэт Аркадзь Куляшоў, аўтар верша «Камсамольскі білет», тэлевізійнай оперы «Раніца» (1967), паэмы пра К.Каліноўскага «Хамуцыюс» (1975).

1922. У сувязі з заканчэннем грамадзянскай вайны ў Расіі была скасаваная ВЧК. Функцыі барацьбы з контрэвалюцыяй і сабатажам перайшлі да НКУС.

1934. У Парыжы правалілася спроба фашысцкага путчу. У адказ левыя сілы таксама паспрабавалі звергнуць урад, але паліцыі ўдалося разагнаць і іх.

1938. Каля горада Кандалакша ўрэзаўся ў гару дырыжабль «СССР В-6», палёт якога мусіў адчыніць першую ў краіне дырыжаблевую лінію Масква—Новасібірск. Загінулі 13 членаў экіпажа, урны з іх попелам былі пахаваныя ў Крамлёўскім муры.

7 лютага

1918. Бальшавіцкія войскі захапілі Кіеў. Украінская Народная Рэспубліка была вымушаная звярнуцца па дапамогу да Германіі і Аўстра-Венгрыі, і ўжо 28 лютага камуністычная акупацыя Кіева была зліквідаваная.

1933. Карабель ВМС ЗША *Ramapo* сустрэўся ў Ціхім акіяне з найвышэйшай з афіцыйна зарэгістраваных хваляў: яе вышыня дасягала 34 м., а хуткасць ураганнага ветру — 126 км/г.

1959. Джон Кук і Роберт Цім нарэшце прызямліліся ў Лас-Вегасе пасля рэкорднага палёту, які доўжыўся 64 дні 22 гадзіны. За гэты час яны маглі б 6 разоў абляцець вакол свету, але бесперапынна кружылі над горадам. Ежу і паліва пілоты ўздымалі на борт на тросе з грузавіка.

1979. На пляжы ў Бразіліі памёр ад інсульту нацысцкі злачынца доктар Ёзэф Менгеле, сумнавядомы бесчалавечнымі эксперыментамі на тысячах вязняў канцлагера Асвенцым.

1984. Амерыканскі астранаўт Брус Макандлес стаў першым чалавекам, які выйшаў «на шпацыр» у космас без страхавочнага фала. Ён праляцеў над Гаваямі на вышыні 264 км побач з чаўнаком *Challenger*, карыстаючыся індывідуальным ракетным рухавіком.

1989. На аўстралійскі горад *Incbir* выпаў дождж з жывых сардзінаў. Навукоўцы мяркуюць, што магчыма, касяк рыбаў быў падхоплены ў аблоке тайфунам (горад знаходзіцца у 50 км ад акіянскага ўзбярэжжа).

1990. Скасаваны шосты артыкул Канстытуцыі СССР, які гарантаваў КПСС манаполію на ўладу.

8 лютага

1724. Пётр I заснаваў расійскую Акадэмію навук.

1834. Нарадзіўся стваральнік Перыядычнай табліцы хімічных элементаў Дзмітрый Мендзялееў.

1894. Нарадзіўся адзін з лепшых брытанскіх асаў Уільям Бішап: падчас Першай сусветнай вайны ён на працягу года збіў 72 нямецкія самалёты.

1914. Нарадзіўся вядомы паэт Валянцін Таўлай, адзін з стваральнікаў Літаратурнага фронту сялянска-рабочых пісьменнікаў Заходняй Беларусі (1933).

1924. У гарадской турме Карсан-сіці, штат Невада, злачынца ўпершыню быў пакараны смерцю ў газавай камеры. Гэта быў кітайскі гангстэр Джы Джон.

1979. Памёр амерыканскі фізік венгерскага паходжання, лаўрэат Нобелеўскай прэміі за вынаходства галаграфіі Дэніс Габар.

1993. У небе над Тэгеранам сутыкнуліся іранскі знішчальнік Су-24 і авіялайнер Ту-134. Выбух быў такі моцны, што на зямлю ўпалі толькі дробныя аскепкі. Загінулі ўсе 130 пасажыраў і 4 расійскія пілоты.

Падрыхтаваў
Юрась БАРЫСЕВІЧ

8 ПАНЯДЗЕЛАК

БТ

06.30 Доброе утро, Беларусь! **07.00** Новости. **07.10** Доброе утро, Беларусь! **08.15** Резонанс. **09.00** Новости. **09.10** Потребительская корзина. **09.25** Телебарометр. **09.40** «Сегодня с вами...» Председатель Центрального правления Белорусского общества инвалидов по зрению А.Нетылькин. **10.05** Здоровье. **10.30** Усадьба. **11.00** Новости. **11.15, 18.05** «Проклятый уютный дом». **12.05** Теленавигатор. **12.25** Музыкальный салон с Э.Езерской. **13.00** Новости. **13.15** «Благородный разбойник Владимир Дубровский». Х/ф. **15.00** Новости. **15.15** «Приключения Шерли Холмс». **15.40** Видеокурс французского языка. **16.05** ТВ — школе. Внеклассное чтение. **3**-й класс. Владимир Короткевич. «Жабки и черепаха». **16.25** Мультфильм. **16.35** Авто-парк. **16.45** Премьера песни. **17.00** Новости (с сурдопереводом). **17.10** «А музыка звучит...» **17.35** «Семейный блюз под звуки акарины». Д/ф. **19.00** Новости. **19.15** Политические диалоги. **19.40** Добрый вечер, Беларусь! **20.40** Колыбельная. **21.00** Панорама. **21.40** Событие. **22.00** «Крейцерова соната». Х/ф. **1-я с. 23.23** Криминальная хроника. **23.30** Белорусский хит-парад. **23.35** Третий тайм. **00.05** Новости.

ОРТ

16.00 «Жестокий ангел». **17.00** Новости. **17.15** Эти забавные животные. **17.45** Здесь и сейчас. **18.05** «Человек в маске». **18.45** «Вечный зов». Х/ф. **19.45** «Спокойной ночи, малыши!». **20.00** Время. **20.40** Погода. **20.50** «Охотники за сновидениями». Х/ф. **21.45** «Взгляд». **22.30** Новость дня. **22.45** Фильмы «Спокойный день в конце войны». «Автостоп». **00.20** Программа передач.

РОССИЯ

06.00, 08.30, 08.45 Доброе утро, Россия. **08.15, 23.20** Дежурная часть. **08.35** «Программа передач». **08.50** Товары — почтой. **09.00** «Санта-Барбара». **09.45** Музыка, музыка... **10.00, 16.00, 19.00, 23.35** Вести. **15.15** Мультфильмы. **15.25** «Первые поцелуи». **16.30** Автомотоспорт: зимнее кольцо. **17.25** «Чужая жена и муж под кроватью». Х/ф. **18.30** Двойной портрет. **19.40** Подробности. **19.50** Любовь с первого взгляда. **20.30 «Избранник». 1-я и 2-я** с. **22.25** «Жара в Лос-Анджелесе».

КУЛЬТУРА

07.00, 23.20 Программа передач. **07.05, 11.30, 13.30, 19.30, 23.00** Новости культуры. **07.25** Мультфильм. **08.15** «Как тяжело мне с вами расставаться...» **08.45** Книжный кладезь. **09.00, 15.00, 17.00** Новости. **09.05** «Прерванный роман Тилли». Х/ф. **10.20** «Петербургские портреты». **10.45** Театр Армена Джигарханяна. **10.50** «Царская ложа». **11.40** «Российский курьер». **12.20** Мультфильм. **12.30** «Рассказы старого сплетника». **12.55** Боярский двор. **13.45** Живое дерево ремесел. **13.50, 15.05** Спектакль «Ромео и Джульетта». **16.30** Поет Елена Образцова. **16.40** «Лукоморье». **17.05** «**2003**». **17.10** «Шалом». **17.35** Вижу цель. **18.00** «Такое кино». **19.10** Чудо-сказка. **19.50** Загадки «Ревизора». **20.30** Арии из оперы «Царская невеста». **20.45** После новостей... **21.05 «Прерванный роман Тилли». Х/ф. 22.20** «Молитва».

НТВ

06.00 Сегодня утром. **08.10** «Ее звали Никита». **09.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00** Сегодня. **09.15** Вчера в «Итогах». **10.15** Куклы. **10.30** Итоги. Ночной разговор. **11.30** «Старый телевизор». **13.30, 21.45 «Скорая помощь». 14.20** «Сегоднячко». **15.30** «Захватчики». **16.30** Впрок. **16.55** «Любовь и тайны Сансет Бич». **17.40** Криминал. **18.40** Герой дня. **19.00** «Крокодил-убийца-II». Х/ф. **20.35** «Итого». **22.35** Сегоднячко. **23.15** Сегодня в полночь. **23.45** Погода. **23.50** Программа передач.

НТВ+

НАШЕ КИНО

09.00 Сегодня в программе. **09.05** «Приключения Шерлока Холмса и доктора Ватсона». **10.10** «Последний дюйм». **11.35 «Зимний вечер в Гаграх». 13.00, 18.40** КиНовости. **13.10** «Выстрел на перевале Караш». **14.45, 16.00** «Россия молодая». **17.25** «Февральский ветер». **18.50** «Самая обаятельная и привлекательная». **20.15** «Приключения Шерлока Холмса и доктора Ватсона». **21.30** «Прощальная гастроль «Артиста». **22.45** Завтра в программе.

МИР КИНО

09.30 Сегодня в программе. **09.35** «Родс». **2-я с.** Д-**13. 10.25** «Урожай». Д-**17. 12.00, 19.15** КиНовости. **12.10** На съемочной площадке фильма «Плутовство». **12.15** «Плутовство». Д-**17. 13.50** «Месть пернатого змея». Д-17. **15.35** «Охотник: последняя схватка». С. **17.05** «Школьный учитель». Д-**13. 17.50** «Невежливый». Д-13. **19.25** «Цыпленок, цыпленок, цыпленок». **Д-17. 19.40** «Загадай желание». Д-**13. 21.10** «Конфликт интересов». Д-17.

СПОРТ

06.00 Еще неделя позади... **06.30, 14.10** Урок бодибилдинга. **06.45, 11.45** Аэробика. **07.10** Горнолыжный спорт. **08.20** Power week. Неделя НХЛ. **09.20** Хоккей. Чемпионат НХЛ. «Нью-Джерси Дэвилз» - «Торонто Мэйпл Ливз». В перерыве (**11.00**) Новости. **12.10** Футбол. Чемпионат Италии. **14.00** Новости. **14.25** «Мистер Олимпия-**97**». **15.20** Американский футбол. **17.35** Бокс. **19.35** Новости. **19.45** Программа передач. **19.50** Горнолыжный спорт. **21.15** Хроника недели. **21.45** «По всем правилам». **21.55** Футбол. Чемпионат Англии. «Чарльтон» - «Уимблдон». В перерыве (**22.45**) Новости

8-Й КАНАЛ

18.00 Программа Кеннета Копланда. **18.30** «Аферистка». Х/ф. **20.00** Уроки для Евы. **20.30** Вечарніца. **20.45** Коллекция **8**-го канала... **21.45** Телемагазин. **22.15** «Заложники дьявола». Х/ф.

ПРИМЕЧАНИЯ:

С — фильмы, рекомендованные для семейного просмотра. Д-13 — фильмы, просмотр которых не рекомендован лицам моложе 13 лет. Д- 17 — фильмы, просмотр которых не рекомендован лицам моложе 17 лет.

9 АЎТОРАК

БТ

06.30 Доброе утро, Беларусь! **07.00** Новости. **07.10** Доброе утро, Беларусь! **08.15** Политические диалоги. **08.40** Потребительская корзина. **09.00** Новости. **09.10** ТВ — школе. Внеклассное чтение. **3**-й класс. Владимир Короткевич. «Жабки и черепаха». **09.30** «Сегодня с вами...» Заслуженная артистка Беларуси Н.Богуславская. **09.55** Мультфильм. **10.05** «На волне взаимопонимания». **11.00** Новости. **11.15, 18.05** «Проклятый уютный дом». **12.10** Третий тайм. **12.40** «А музыка звучит...» **13.00** Новости. **13.10** «Все под богом ходим». Д/ф. **14.05** Туробъектив. **14.25** Бездельник. **15.00** Новости. **15.15** «Приключения Шерли Холмс». **15.40** Видеокурс английского языка. **16.05** ТВ — школе. Белорусская литература. **6**-й класс. Повесть Янки Брыля «Сиротский хлеб». **16.30** «Наперекор судьбе». **17.00** Новости (с сурдопереводом). **17.10** Уроки Н.Новожиловой. **17.35** Гости в дом. **19.00** Новости. **19.15** «Алло, «Событие». **19.55** Добрый вечер, Беларусь! **20.40** Колыбельная. **21.00** Панорама. **21.40** Событие. **22.00** «Крейцерова соната». **2**-я с. **23.10** Криминальная хроника. **23.15** Белорусский хит-парад. **23.20** Музыка без границ. **23.50** Новости.

ОРТ

08.00, 11.00, 14.00, 17.00 Новости. **08.15, 16.00** «Жестокий ангел». **09.15** «Взгляд». **10.00** Смехопанорама. **10.30** Играй, гармонь любимая! **11.15** «Вместе». **14.15** «Каспер, который живет под крышей». **14.50** Счастливый случай. **15.35** ...До шестнадцати и старше. **17.15** Угадай мелодию. **17.45** Здесь и сейчас. **18.05** Тема. **18.45** «Вечный зов». **19.45** «Спокойной ночи, малыши!». **20.00** Время. **20.40** Погода. **20.50** «Старшая сестра». Х/ф. **22.40** «Жизнь замечательных людей». **23.10** Новость дня. **23.25** Программа передач.

РОССИЯ

06.00, 08.30, 08.45 Доброе утро, Россия. **08.15, 23.25** Дежурная часть. **08.35** «Программа передач». **08.50** Товары — почтой. **09.00** «Санта-Барбара». **09.45** Музыка, музыка... **10.00, 16.00, 19.00, 23.40** Вести. **15.15** Сказочный полдник. **15.30** «Первые поцелуи». **16.30** «Башня». **16.55** Компьютер. **17.05** «Дело». Х/ф. **18.30** Двойной портрет. **19.40** Подробности. **19.50** «Аншлаг». **20.25** «Прокол». Х/ф. **22.20** «Избранник». **3**-я с.

КУЛЬТУРА

07.00, 23.20 Программа передач. **07.05, 11.30, 13.30, 19.30, 23.00** Новости культуры. **07.25** «Такое кино». **08.35** Русская усадьба. **09.00, 15.00, 17.00** Новости. **09.05, 21.05** «Потомок белого барса». Х/ф. **1**-я с. **10.10** Омоним. **10.35** Вижу цель. **11.05** Образ жизни. **11.40** «Без визы». **11.45** За околицей. **12.00** Биатлон. Чемпионат мира. Женщины. **14.00** А.Платонов. «Скрипка». **14.45** Поклонникам Терпсихоры. **15.05** «Арабелла возвращается, или Румбурак — король страны сказок». Х/ф. **15.35** «Лукоморье». **15.55** «Пушкин и судьбы русской культуры». **16.35** «Открытие таланта». **17.05** «**2003**». **17.10** Ортодокс. **17.30** Ноу-хау. **17.45** «Вокзал мечты». **18.15** «Сокровища Петербурга». **18.30** «Шекспир. XX век». **19.15** Чудо-сказка. **19.50** Док. фильмы. **20.45** После новостей... **22.10** «Петербургские портреты». **22.35** «Из концертного зала».

НТВ

